Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманні і суды ў Мінску дапоўнена

23.03.2017 **Тэгі**: затрыманні



Анатоль Шумчанка.

У Мінску затрыманыя лідар прадпрымальнікаў **Анатоль Шумчанка і Алесь Лагвінец**. Пра гэта ён напісаў у Facebook.


Па інфармацыі "Еўрарадыё" , Шумчанка знаходзіцца ў Маскоўскім РУУС. У чым яго вінавацяць, пакуль невядома. Шумчанка — кіраўнік Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Перспектыва".

Як вядома, 25 сакавіка ў Мінску мусіць адбыцца вулічная акцыя, прысвечаная Дню Волі. Па ўсёй Беларусі праходзяць затрыманні актывістаў дэмакратычнага руху.

Апоўдні стала вядома пра затрыманне былога намесніка старшыні руху «За свабоду» **Алеся Лагвінца.** Яго разам з сынам забралі каля хаты і адвезлі на мінім мікрааўтобусе з нумарам 93-28 НІ 7. Пазней сына адпусцілі. Ён паведаміў у сацыяльных сетках, што Алеся пры затрыманні збілі. Лагвінца старэйшага скруцілі, разьбілі яму твар. Яго сына спачатку закавалі ў кайданкі, але пасьля праверкі торбы і тэлефона адпусьцілі, сказаўшы, што «ёсьць загад браць толькі Алеся Лагвінца».

Стала вядома, што Шумчанку і Лагвінца вязуць у суд Маскоўскага раёна Мінска.

Затрыманы 23 сакавіка ў Менску былы намеснік старшыні руху „За Свабоду” Алесь Лагвінец шпіталізаваны са страсеннем мозгу, чэрапна-мазгавой траўмай і закрытым пераломам носа, паведаміў яго сын Антон у сацыяльнай сетцы „Фэйсбук”.



Затрыманы абаронца Курапатаў **Раман Васільеў**. Жонка затрыманага Кася Васільева паведамляе, што яго з дому забіраюць «людзі ў цывільным», прад’явілі ордэр на ператрус, піша Радыё Свабода.

Стала вядома, што затрыманы намеснік старшыні Аб'яднаннай грамадзянскай партыі **Мікалай Казлоў**. Пра гэта паведаміў чалавек, з якім Мікалай павінен быў сустрэцца сёння. Зараз тэлефон Мікалая Казлова недасяжны.

Затрыманы абаронца Курапатаў **Уладзь Яроменак.**

Яшчы адзін абаронца Курапатаў **Зміцер Крэменецкі** таксама затрыманы. Яго дзяўчына паехала высвятляць на падставе чаго адбылося затрыманне**.**


Стала вядома пра затрыманне актывіста **Паўла Юхневіча**. Яго затрымалі на выхадзе з працы.

Таксама затрыманы **Яўген Міхасюк.** Па папярэдняй інфармацыі, ён знаходзіцца ў Першамайскім РАУС.

На дадзены момант невядома, дзе знаходзіцца студэнт БНТУ **Іван Кавальчук**. Яго тэлефон недаступны, а ў інтэрнаце, дзе ён жыве, адбыўся вобшук.

Твитнуть






Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"

"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка


Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY